ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1989
ЧАЦВЕР
7
ВЕРАСНЯ
№ 23(1616)

ДЗЕНЬ ВЕДАЎ

Як першакурснік знаёміцца з універсітэтам? Звычайна гэта адбываецца выпадкам, паступова, дзякуючы якой-небудзь патрэбе. Гэта значыць, што ён застаецца неінфармаваным шмат аб чым, што яму магло б быць неабходным. Таму бачыцца вельмі карыснай ідэя, абараніць якую паспрабавалі на пачатку новага вучэбнага года ў нашым універсітэце. «Вечар ведаў» — так называлася сустрэча студэнтаў ўсіх курсаў і факультэтаў у актавай зале. Асаблівая ўвага — першакурснікам. Выступленне творчых калектываў універсітэта было адначасова і знаёмствам з навічкамі, і праглядам студэнцкіх талентаў.

Аўкцыён вельмі патрэбных рэчаў прымусіў публіку трохі пахвалявацца. Што прапанавалі? Рэліквіі універсітэта і пуцёўку ў прафілакторый, фота рэктара і ордэр на засяленне ў інтэрнат. Апошні, дарэчы, быў прададзены за 95 рублёў.

— Няма іншага выйсця,— растлумачыла першакурсніца мехмата Валя Апанасёнак.— Першакурсніку цяжка атрымаць пакой, а тут адразу на 5 год. Не шкада тых грошай!

Думаецца, што тэматыку наступнага вечара ведаў мэтазгодна было б пашырыць, і акрамя мастацкіх калектываў прадставіць «візітныя карткі» факультэтаў, расказаць аб студэнтах-навукоўцах і навуковых калектывах, добра было б, каб выступілі прадстаўнікі дэканатаў і рэктарата. Усё гэта не дазволіць першакурснікам абмяжоўвацца рамкамі сваёй групы і свайго факультэта.

С. ГРЫЦ.
Фота АЎТАРА.

САКРЭТ ФІРМЫ

АДКУЛЬ БЯРУЦЦА ВЕЧНЫЯ СТУДЭНТЫ

Колькі гадоў патрэбна прасядзець за студэнцкай партай, каб стаць уладальнікам запаветнага універсітэцкага дыплома? На гэта, здавалася б, простае пытанне ў Фінляндыі ніхто не дасць адназначнага адказу. Справа ў тым, што тэрміны навучання ў ВНУ не абмежаваны. Прынцып «акадэмічнай свабоды» прадугледжвае, што кожны студэнт, калі ён выконвае вучэбную праграму, мае права сам вырашаць, колькі гадоў яму вучыцца і калі трымаць выпускны экзамен.

Як правіла, вучоба расцягваецца на 6—8 гадоў, а сярэдні ўзрост выпускнікоў дасягае зараз 28 гадоў. У кожнай ВНУ ёсць нямала «вечных» студэнтаў. Па паведамленнях газеты «Финниш бизнес рипорт», у 1987 годзе 12 працэнтаў студэнтаў мелі «стаж» навучання звыш 9 гадоў.

Затрымлівацца на многія гады ў аўдыторыях фінаў прымушае часам не столькі імкненне да атрымання глыбокіх ведаў, колькі чыста жыццёвыя абставіны. Усе ВНУ у краіне належаць дзяржаве і навучанне ў іх бясплатнае, аднак стыпендыя студэнтам не выплачваецца і многім даводзіцца думаць не толькі пра вучобу, але і пра хлеб надзённы. Праўда, студэнт можа атрымаць ад дзяржавы ці пад дзяржаўную гарантыю ад прыватнага банка крэдыт, аднак гэтых грошай часта не хапае: вельмі дарагія неабходныя вучэбныя дапаможнікі.

Могуць узнікнуць сумненні: ці не зніжаецца пры такой сістэме якасць падрыхтоўкі спецыялістаў? Яны аднак рассейваюцца, калі толькі нагадаць пра поспехі, дасягнутыя Фінляндыяй у апошнія дзесяцігоддзі ва ўмацаванні свайго навуковага патэнцыялу, стварэнні і шырокім практычным укараненні прагрэсіўных прамысловых тэхналогій.

А. СУРЫКАЎ.
(Кар. ТАСС).

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
ТЭЛЕТАЙП
УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА

АДКРЫТЫ КОНКУРС

на лепшую навуковую работу ў галіне метадалогіі развіцця універсітэцкай адукацыі як састаўной часткі цыкла даследаванняў па праблеме «Інтэлектуальная прафесійная дзейнасць, вышэйшая адукацыя і грамадскі прагрэс» аб'яўляе даследчыцкі цэнтр Дзяржадукацыі СССР па праблемах кіравання якасцю падрыхтоўкі спецыялістаў.

У конкурсе могуць удзельнічаць як творчыя калектывы, так і асобныя вучоныя, якія маюць навуковы задзел у данай галіне. Для заахвочвання пераможцаў конкурсу прадугледжаны фонд грашовых сродкаў памерам 1000 рублёў.

Лепшыя работы будуць рэкамендаваны да выдання ў нашай краіне і за мяжой. З іх аўтарамі плануецца заключыць працоўныя пагадненні на працяг даследаванняў ў 1990 годзе.

В. КРЫМАВА,
загадчыца аддзела навукова-тэхнічнай інфармацыі.

ПРЫБАВІЎ КЛОПАТАЎ

новы навучальны год не толькі студэнтам і выкладчыкам. Стала больш іх і ў работнікаў бібліятэкі. Сёння самая надзённая задача — забяспечыць студэнтаў камплектамі падручнікаў. Зараз яны ўжо сфарміраваны і чакаюць сваіх гаспадароў. Як хутка трапяць кнігі ў іх рукі, залежыць ад студэнтаў старэйшых курсаў — у бліжэйшы час яны павінны здаць усю літаратуру, якой карысталіся ў мінулым годзе.

Дарэчы, сёлета (хоць і ў невялікай колькасці) бібліятэка прапануе сваім чытачам і дапаможнікі па грамадскіх дысцыплінах.

З. МІХНЕВІЧ.

ВЫ ПАДРЫХТАВАЛІСЯ

да новага навучальнага года? Неабходныя падручнікі, вучэбныя дапаможнікі у вас ёсць? Калі не, зазірніце ў кіёск, што знаходзіцца ў галоўным корпусе універсітэта. Там вы абавязкова што-небудзь набудзеце, бо выбар літаратуры вельмі разнастайны. Прапануем звярнуць увагу на наступную літаратуру: Богданов Ю. С., Кастрица О. А. «Начала анализа в задачах и упражнениях»; Милованов Н. В. и др. «Алгебра и аналитическая геометрия»; Воднев В. Т. и др. «Основные математические формулы»; «Толковый математический словарь. Основные термины»; Колмогоров А. Н., Фомин С. В. «Элементы теории функций и функционального анализа».

Т. ГРЫДЗЮШКА.

ПІНГ-ПОНГ

«Вольны» ці «нявольнік»?

22 жніўня ў «Учительской газете» было надрукавана новае Палажэнне аб ВНУ. У ім у раздзеле «Студэнты вышэйшых навучальных устаноў», у прыватнасці, гаворыцца, што зараз студэнты маюць права:

— вольнага наведвання лекцый, пачынаючы з другога курса,

— ставіць пытанне аб замене выкладчыкаў, якія не забяспечваюць якаснага правядзення вучэбных заняткаў.

Ці правамоцны гэтыя пункты новага Палажэння аб ВНУ у нашым універсітэце?

С. ПРАКАПОВІЧ,
студэнт.

Пытанні аб «вольным наведванні» і «вольным выбары» даўно ўжо сталі «притчей во языцех» для студэнцтва. Не раз з гэтай нагоды ўзнікалі на некаторых факультэтах непаразуменні і нават канфлікты. Сям-там і сапраўды вольнае наведванне лекцый было незаконна ўзаконена. І вось з'явіўся афіцыйны дакумент. Праўда, незразумела пакуль, што гэта: рэкамендацыі, парады ці ўсё-такі «асноўны закон» для ВНУ нашай краіны? Растлумачыць «новаўвядзенне» мы папрасілі намесніка начальніка вучэбнага аддзела універсітэта Анатоля Мікалаевіча БАРАНАВА.

— Новае Палажэнне аб ВНУ зараз выконвае і дарадчую, і заканадаўчую функцыі адначасова. Справа ў тым, што наш універсітэт яшчэ не мае свайго статуса. Ён будзе распрацаваны прыкладна праз месяц-паўтара. І многія пункты новага Палажэння аб ВНУ будуць выкарыстаны пры стварэнні Статуса Белдзяржуніверсітэта. Цяпер жа, часова, універсітэт жыве якраз па новаму Палажэнню.

— Значыць, і вольнае наведванне, і выбар выкладчыкаў сёння ва універсітэце ўжо рэальнасць?

А. М. БАРАНАЎ. Дакладней кажучы, гэта права студэнтаў. Аднак тут, як у кожнай новай справе, шмат нявызначаных, дадатковых цяжкасцей.

Выбар выкладчыкаў, напрыклад, у студэнтаў абмежаваны. А ў некаторых выпадках і ўвогуле магчымасці зрабіць гэты выбар у студэнтаў не будзе. Таму што колькасць выкладчыкаў строга рэгламентавана штатным раскладам.

— У такім разе студэнтам нічога не застаецца, як займацца самаадукацыяй.

А. М. БАРАНАЎ. Самаадукацыя неабходна кожнаму студэнту нават пры наяўнасці ідэальнага выкладчыка. Гэта, дарэчы, асноўная прычына ўвядзення «вольнага наведвання». Што ж датычыць прафесійна непрыдатных выкладчыкаў, то, думаецца, такіх набярэцца не шмат. У крайнім выпадку, як кажуць, незаменных людзей няма.

— Аднак падкрэсліць сваю «незаменнасць» перад студэнтамі кожны выкладчык можа ў час сесіі?

А. М. БАРАНАЎ. Не выключэнне, што некаторыя выкладчыкі будуць рабіць улік і кантроль студэнтаў уласнаручна, для сябе. Асцерагчы «свабодалюбівых» студэнтаў ад «выкладчыцкіх рэпрэсій» за ненаведванне лекцый могуць толькі цвёрдыя веды саміх студэнтаў. Відавочна, што і вучэбныя кафедры павінны дапамагчы студэнтам пры самастойным авалоданні тымі ці іншымі дысцыплінамі. Перш за ўсё неабходна «абнародваць» метадычныя распрацоўкі, рэкамендацыі, параіць пэўную літаратуру, даць, калі гэта патрэбна, кансультацыю.

— Няблага было б ўкараніць нарэшце і надрукаваныя канспекты лекцый выкладчыкаў.

А. М. БАРАНАЎ. Я асабіста супраць. Канспекты лекцый — гэта ўсё ж тэзісы, якія выкладчык у працэсе навучання дэталёва тлумачыць і развівае. Акрамя таго, у такіх «дапаможніках» не будзе «навінак», што часта з'яўляюцца ў перыёдыцы. Канспекты, вядома, будуць старэць. Да таго, большасць выкладчыкаў, ідучы на лекцыі, зараз разлічвае на дыялог, таму загадзя складае адпаведны план-канспект. Дыскусія і абмеркаванне — вельмі цікавая і карысная форма навучання. І здаецца, што час гарачай і дзелавой спрэчкі ў аўдыторыі больш карысны, чым некалькі гадзін штудзіравання ў бібліятэцы.

— Вы лічыце, што лепш пабываць на лекцыях?

А. М. БАРАНАЎ. Катэгарычна не. Я — за разумнае чаргаванне ўсіх форм навучання. Нельга трымаць за панацэю штосьці адно. Бо ў кожнай, нават самай карыснай справе, ёсць нешта недасканалае.

Вольнае наведванне, безумоўна, адкрывае шырокія магчымасці для самаадукацыі, дазваляе кожнаму студэнту працаваць над сабой, набываць веды самастойна. Але ж нельга забываць, што ва універсітэт часта прыходзяць навучэнцы, якія не прызвычаіліся самастойна працаваць. Наша сярэдняя школа, на жаль, такую дысцыпліну не выкладае. І частка студэнтаў можа ўспрыняць вольнае наведванне як адпачынак, як «свята непаслухмянасці». Таму пажадана, каб з боку вучэбных кафедраў праводзіўся перыядычны кантроль за паспяховасцю студэнтаў, за якасцю засвойвання вучэбнага матэрыялу. У форме прамежкавых залікаў ці проста субяседвання — гэта не мае значэння.

Гутарку вёў
М. МАСТОЎСКІ.

УСПАМІНЫ АБ ЛЕЦЕ

Не крыўдуй, што даведаўся пра мой ад'езд у апошнюю хвіліну. Доўга вагалася: адпачынак у горадзе ці лета там, дзе ніхто не стане лічыць мяне маленькай і танюткай. Бо там — праца. Не сумуй. Лепш пішы лісты. Яны будуць цёплыя і пяшчотныя. Я ведаю. А зараз прабач. Мяне дзяўчаты чакаюць. Мы дамовіліся ад'язджаць з песняй...

Юнак даўно дачакаўся сваю няўрымслівую будатрадайку. А цяг-нік зноў запаланілі гітарных струн. Едуць песні на «бульбу» сельгасатрады. Аб іх — у наступным нумары. Сёння — аб леце мінулым.

Фота С. ГРЫЦА.

У спецвыпуску чытайце:
лісты падзякі;
«Зьніч» расказвае пра сябе;
які шлях вядзе да сэрца мужчыны.

Не першы раз сустракае Карэлія студэнцкія атрады з Беларусі. Семнаццаць ЛСА працавала тут і ў гэтым годзе. Сярод іх — чатыры універсітэцкія.

Добрае імя

І трэба сказаць, папрацавалі яны выдатна. ЛСА «Зьніч» (філалагічны факультэт) і «Няміга» (факультэт радыёфізікі і электронікі) перавыканалі планавыя заданні больш чым удвая. Лепшым паказчыкам працы студэнтаў былі жылыя дамы і аб'екты прамысловага прызначэння ў пасёлках Летнярэчанскі, Машозера і Тунгуда. Значныя і вынікі грамадскай і культурнай дзейнасці гэтых атрадаў. У «Зьніча» — гэта выступленні з канцэртамі перад жыхарамі пасёлка, дапамога мясцовай школе і клубу, дзіцячаму саду. Вялікую падзяку атрымалі байцы атрада «Няміга» ад работнікаў мясцовага клуба за актыўны ўдзел у культурным жыцці пасёлка Новае Машозера. А калі ў раёне запалалі лясныя пажары — актыўна ўдзельнічалі будатрадаўцы ў іх тушэнні. Кіраўнікі Саснавецкага леспрамгаса, у якім працавалі філолагі і радыёфізікі, на развітанне жадалі толькі аднаго — каб на будучы год хлопцы прыехалі сюды зноў.

Яшчэ два атрады з юрыдычнага факультэта — імя П. Машэрава і Ф. Дзяржынскага працавалі ў кааператыўнай фірме «Поўнач-2», адным з заснавальнікам якой з'яўляецца Карэльскі абласны штаб студэнцкіх атрадаў. Для кіраўнікоў фірмы ды і для студэнцкіх атрадаў гэта быў першы вопыт супрацоўніцтва. Праблем хапала. Не ўсё задуманае давялося ажыццявіць. Тым не менш вынікі вельмі добрыя.

Кваліфікавана арганізоўвалі работу атрадаў Сяргей Лапцёнак і Валодзя Куліковіч («Зьніч»), Віктар Козіч («Няміга»), Саша Граблюк (ЛСА імя П. Машэрава), Андрэй Бубен (ЛСА імя Ф. Дзяржынскага).

З адменай камандных метадаў кіравання атрады атрымалі амаль поўную самастойнасць. І выкарыстоўваюць яе па-свойму. Іншыя працуюць ад цямна да цямна і непакояцца толькі за матэрыяльны вынік працы. Асабліва відавочна праявілася гэта ў маскоўскіх і куйбышаўскіх атрадах, якія працавалі ў Карэліі. Беларускія атрады ад іх адрозніваліся будатрадаўскімі традыцыямі. Таму і застаюцца пасля дзейнасці атрадаў з Беларусі не толькі пабудаваныя аб'екты, але і ўдзячнасць мясцовых жыхароў за канцэрты, адрамантаваныя школы і дзіцячыя дамы.

А. РУСАКОВІЧ,
камісар Лоўхскага занальнага студэнцкага атрада.

«Будуюць студэнты з Мінска»

У народзе гавораць, каб дарма не пражыць, патрэбна абавязкова пабудаваць за жыццё дом. Гэтым летам студэнты з будаўнічага атрада «Зьніч» БДУ імя У. І. Леніна ўзвялі ў нашым пасёлку два дамы. Акрамя таго, рабяты пабудавалі нашаму леспрамгасу лінію для распілоўкі хлыстоў.

«Будуюць студэнты з Мінска»,— так паважліва гаварылі мы, летнярэчанцы, пра работу беларускіх хлопцаў. Здаралася, час падыходзіць да поўначы (у Карэліі ночы летам светлыя), а нашых студэнтаў няма дома — працуюць. І будуюць на сумленне, памятаюць, што жыць потым у іх дамах людзям. Вось з каго б браць прыклад летнярэчанскай моладзі! Пакуль жылі зьнічаўцы ў пасёлку, каля іх дома было заўсёды шмат нашых дзяцей — і ў тэніс, і ў валейбол, і ў футбол гулялі са студэнтамі, і песні беларускія слухалі. Паказалі студэнты ўсяму пасёлку канцэрт, з'ездзілі ў Беламорск на фестываль будатрадаў. Яшчэ ніколі такога не было, каб у студэнтаў, якія прыязджалі ў Летнярэчанск, на ўсё гэта хапала часу. А «Зьніч» яшчэ і школе, і дзіцячаму саду дапамог.

Хачу выказаць словы ўдзячнасці камісару атрада Валодзю Куліковічу: жыву адна, а ён з рабятамі хоць ненадоўга дапамог забыць пра адзіноту.

У час вайны праходзіла ў саставе сапёрнай брыгады цераз усю Беларусь. І яшчэ з тых часоў нашу ў сэрцы добрую памяць пра беларускі народ, а сёння бачу ўнукаў таго ваеннага пакалення і спакойна робіцца на сэрцы.

Дзякуй вам, беларускія студэнты, сардэчны!

Валянціна Васільеўна КАРАЛЁВА,
ветэран вайны і працы.
п. Летнярэчанскі Карэльскай АССР.

ШТО ЗАПОМНЮ, БУДАТРАД?

НЕ ПРЫ ЧЫМ...

У цемры гэты будынак нагадвае... асабняк англійскага лорда. Тут хочацца доўга слухаць цішыню і ўспамінаць любімыя казкі. Тут не верыцца, што паветра недзе забруджана — так лёгка дыхаецца. Няўжо ёсць у свеце вялікія гарады і вялікія праблемы?..

Мабыць, ёсць, але дзесьці вельмі далёка. Як і ад Рубяжэвічаў — тых цудоўных мясцін, дзе працаваў будатрад «Ветразь» летась. Ён, дакладней, сельскагаспадарчы, а не будаўнічы: дзяўчаты палолі маладыя фруктовыя дрэвы, парэчкавыя кусты і капусту ў саўгасе «Клецкі» Клецкага раёна — садоўніцкай гаспадарцы. Вядома, карысная справа, і кожная пара рук каштоўная. Але ці настолькі, каб ехалі дзеля яе 15 студэнтак універсітэта? Небясспрэчнае пытанне, але ж...

Рамантычны парыў у іх быў — як у сапраўдных аматараў вандраванняў (дзяўчаты з геаграфічнага факультэта), у атрад яны прыехалі, як і ў мінулым годзе, адразу пасля вытворчай практыкі, некаторыя нават да бацькоў завітаць не паспелі. Але наўрад ці адзін настрой ды яшчэ традыцыйную будатрадаўскую форму адзення можна лічыць дастатковымі ўмовамі для таго, каб адчуць сябе часткай вялікага руху. Так, Ганаровага байца абралі — загінуўшую ў сутычцы з бандытамі бортправадніцу Тамару Жаркую, і газету, ёй прысвечаную, афармілі. А вось на фестываль, арганізаваны занальным штабам для ўсіх атрадаў, ехаць не захацелі, аддалі перавагу экскурсіі па Нясвіжы (фестываль праходзіў там жа, і не было ніякай праблемы завітаць на яго). З суседзямі, будатрадам «Славуціч» з юрыдычнага факультэта, дружбы не атрымалася — не хапіла для гэтага толькі аднолькавай формы, можа і таму, што яна сапраўды была толькі знешняй праявай дачынення да будатрадніцкага руху з аднаго і з другога боку.

Дык што ж будатрадаўскае было ў іх 20-дзённым жыцці ў вёсцы Сякерычы? Калі нагадаць спрадвечныя мэты студэнцкіх атрадаў,— выходзіць, амаль нічога. Дзяўчаты, мабыць, пакрыўдзіліся б на такое сцвярджэнне — вельмі дружна яны жылі. І камандзірам Свету Грузневіч абралі — лепей не прыдумаць, і многія з іх ужо другі год запар пажадалі працаваць у сельгасатрадзе. Дык і ноч пасвячэння ў байцы ў іх была ж... Можа выклікаць крыўду і такое справядлівае непаразуменне: гэты атрад з яму падобных не горшы, калі не лепшы. Гэта і сумна...

А можа абышлося б і без крыўды. Калі не лічаць дзяўчаты, што «барацьба за мірнае суіснаванне» з мясцовай моладдзю можа быць значнай часткай студатрадаўскага жыцця. Не было б гэтага — засталося б нямнога: гэта ж так сумна сядзець, не адыходзячы, каля будынка, дзе жывеш, доўгімі-доўгімі і такімі прыгожымі вечарамі, нават калі добра выспаўся напярэдадні. У вёсцы, хоць яна і цэнтральная сядзіба, няма нават клуба, і кіно не прывозяць. Даводзіцца прымаць гасцей у сябе. Але ж яны заходзяць у дзіўна пастаянным выглядзе, ды яшчэ з абавязковымі «балёнчыкамі», як называюць мясцовыя жыхары ёмкасці (і вялікія!) з самагонам. Таму добрых адносін з большасцю з іх не атрымалася: хлопцы навакольных вёсак не знайшлі сярод дзяўчат амаль ідэальнага напітку» — так з самага пачатку і не сталі сябрамі.

А што ж застанецца — як памяць, як прыбаўка да жыццёвага вопыту? Акрамя пасвячэння ў байцы, можа яшчэ Дзень імянінніка — малавата на 20 дзён... З Рубяжэвічаў у мінулым годзе яшчэ прывезлі захапленне непаўторным навакольлем, добрыя ўспаміны аб узаемаразуменні з іх жыхарамі. Але ж — будатрад тут пры чым?

В. БЯГУН.

Знаёмцеся: повар Сева

Настойліва ходзяць чуткі, што шлях да сэрца мужчыны абавязкова перасячэ вобласць яго страўніка. А якія сцяжынкі вядуць да сэрцаў дваццаці двух мужчын? (Гэта наш СБА «Зьніч», які пакінуў родныя зялёныя сцены філфака і паехаў працаваць у далёкую Карэлію).

Прыязджайце і адшукайце дваццаць трэцяга мужчыну. З шырокім вяснушкаватым тварам, акрэсленым зверху смаляной шавялюрай і знізу — чорнай барадой, у белых кароткіх штоніках і такой жа куртачцы. Знайшоўшы, спытайце, ці не яго зваць Усевалад Рагойша... І калі ён адлюструе на сваім твары непаразуменне і адкажа сцвярджальна, спытайце, які ўсё ж такі шлях знайшоў ён, повар будатрада, да чарады вусатых, барадатых і іншых? І калі вы сапраўды натрапіце на нашага Севу, тады ён павінен сціпла ўсміхнуцца, махнуць рукой і прапанаваць «гарбаткі».

А паглядзіце, як апетытна паядаюцца зьнічаўцамі кулінарныя вырабы Севы! А якая дзіцячая радасць свеціцца на тварах байцоў атрада ўвесь дзень, калі пабалуе ён галодную студэнцкую брацію манай кашай!

Ціхенька зазірніце на кухню ў той час, калі пачуеце там далёка не мужчынскую гамонку... І вы ўбачыце над падаконнікам ці не з дзесятак дзіцячых галоў, аддана павернутых да студэнцкага кармільцы. І не ведаю нават, чым прыцягвае іх Сева...

А калі вы, не дай бог, захварэеце, Сева дапаможа: ён палечыць, ён скажа абавязкова што-небудзь суцяшальнае.

Так што не ламайце галаву над тым, якая ж дарога вядзе ў тупікі мужчынскага сэрца. Сева Рагойша ў гэтых нашых тупіках крочыць упэўненым поступам.

Алесь ДАВЫДАЎ.
п. Летнярэчанскі.

САМІ ПРА СЯБЕ

«Зьніч»— значыць маланка

Надвор'е ў Карэліі можа мяняцца на дзень і два, і тры разы: мяжуе паўночны край з морам. Вялікая карэльская прастора, якая паступова пазбаўлялася сваіх лясных параснікаў, і белае бязночча — вечар незаўважна абарачаецца раніцай, дрыгва — замест звыклай чорнай зямлі і вось яна, сапраўдная марошка! — здзіўляла спачатку. Гэтак жа, як і ўразіла ўяўленне самай простай ізуверскай вынаходлівасцю гісторыя нараджэння Беламорканала: вось яна — рукатворная пачвара, вадзяны надмагільны помнік для магіл тысяч «энтузіястаў»! Усё гэта новае для байцоў студэнцкага будаўнічага атрада «Зьніч» з Мінска.

«Зьніч» — гэта дваццаць чатыры беларускія студэнты разам з ганаровым байцом атрада — таленавітым беларускім пісьменнікам Уладзімірам Сямёнавічам Караткевічам: «Зьніч» — так па-беларуску здаўна празвана маланка ў руках язычніцкага Перуна, гэта сімвал вечнага непаседлівага агню. Два месяцы працавалі зьнічаўцы па дагавору з Саснавецкім КЛПХ. Работы шмат, але за атрадам справа не стане: скажам, брыгада ў саставе Сашы Вайтко, Ігара Бараўко, Колі Лісоўскага, Васі Манько, Дзімы Клемята і Юры Шабеты працуе кожны дзень з раніцы да таго часу, які ў нас на радзіме называюць цёмнай парой. І так гатовы працаваць усе байцы атрада, абы была справа.

Ужо між справай дапамаглі тое-сёе падладзіць у гаспадарках мясцовай школы і дзіцячага сада. Але ўсё ж асноўная работа — па дагавору.

...А калі яны вяртаюцца ў новы свой дом, рабят сустракае дабрэйшы повар Сева Рагойша і — корміць, корміць... А калі сёння Мікола Кананович і Сяргей Іваноў пайшлі на рыбалку, то заўтра будзе «Зьнічу» юшка!

З'яўляецца вольны час, і перад домам студэнтаў летнярэчанская дзятва пачынае гульні ў валейбол і футбол, тэніс з беларускімі хлопцамі.

Амаль усе будатрадаўцы — філолагі па адукацыі, таму адразу з мясцовай бібліятэкі перакачавалі ў студэнцкі домік некалькі дзесяткаў кніг: Філдзінг і Стэрн, Брэхт і Свіфт, Булгакаў і Форш, Караткевіч і Вазнясенскі, карэла-фінскі эпас «Калевала».

Студэнты — народ заўсёды вясёлы і таленавіты. Нездарма жыве яшчэ да сённяшняга дня сярэдневяковы гімн студэнтаў «Гаўдэамус» («Будзем радавацца»). Валодзя Куліковіч (баян), Саша Века (вакал), Коля Пархімовіч (рытм-гітара), Алесь Давыдаў (бас-гітара), Анатоль Шаршнёў (клавішныя) адразу пачалі рыхтаваць канцэрт для летнярэчанцаў. Адась Каліта малюе, і зьнічаўскія насценгазеты — справа яго рук. Уласны фотакарэспандэнт атрада Сяргей Кавеза стаў ужо хранікёрам «Зьніча».

Верасень зноў сабраў пад дах мінскай альма-матэр — Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна — сённяшніх будатрадаўцаў. А ліпень-жнівень 1989 года — яшчэ адзін рабочы семестр «Зьніча».

Сяргей ШАПРАН.
п. Летнярэчанскі.

АГУЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ — НЕЦІКАВАЕ ІСНАВАННЕ?

Крыніца кантрастаў

Сельгасатрад хімічнага факультэта «Крыніца» і Іпатаўскі кансервавы завод Стаўрапольскага краю — старыя знаёмыя і сябры. Тыя са студэнтаў, хто працуе тут не першы раз, ужо сталі сапраўднымі спецыялістамі ў кансервавай справе. Гэта я зразумеў у размовах з дзяўчатамі, і ад кіраўніцтва завода пачуў пра тое, што прыязджаюць сюды дзяўчаты і хлопцы «без зеленого понятия», а сезон заканчваюць даволі кваліфікаванымі спецыялістамі, якія здольны не толькі дапамагчы кадравым рабочым пры неабходнасці, але і замяніць іх. Праца — напружаная, бесперапынная. Напружаны цела і нервы — канвеер. Прадукцыя завода: сокі, кампоты, джэмы.

Як працавалі дзяўчаты і хлопцы? Добрыя водгукі я чуў і ад кіраўніцтва завода, і ад работніц. З задавальненнем хачу адзначыць, што не толькі за стараннасць у працы ўпадабалі жанчыны дзяўчат, але і за чуллівасць, заўсёдную гатоўнасць дапамагчы, асабістую адказнасць.

— Калі будзеце хваліць у газеце, то хваліце ўсіх. Яны заслугоўваюць! — патрабавальна звярнулася да мяне работніца, калі ўбачыла, што я збіраюся фатаграфаваць. Як магу, просьбу яе выконваю.

Добрыя словы давялося пачуць пра Таню Шчэрбу, Дзіну Рудзік, Іну Шыманскую, Наташу Бандаровіч, Лену Белічэнка, шмат каго яшчэ.

Пасля знаёмства з атрадам падумалася, што «Крыніца» — крыніца кантрастаў. Наколькі напружанай была праца ўдзень, настолькі млявым і незанятым вольны час пасля яе. Шукаць прычыны толькі ў вялікай стомленасці ці ў адсутнасці згуртаванасці калектыву было б, на маю думку, не вельмі правільна. Адарванасць ад зводнага атрада, дзе, здаецца, на прызнанню рабят, спаборніцтва само развіваецца, таксама зрабіла сваю справу. Да таго ж, асабістая пасіўнасць кожнага ператварыла агульнае жыццё ў нецікавае існаванне.

С. ГРЫЦ.
Фота аўтара.

ПЯЦЬ «ЗОРАЧАК» З «МЛЕЧНАГА ШЛЯХУ»



Амаль для ўсіх знаёмых і сяброў задумка гэтых пяці дзяўчат са студатрада «Млечны Шлях» здалася не чым іншым, як дзівацтвам. Сапраўды, дзе гэта бачна, каб гарадскія дзяўчаты добраахвотна выказалі жаданне працаваць у летнія вакацыі... даяркамі. І не за блізкі свет— у незнаёмым, а таму загадкавым краі, а ў роднай Беларусі — у саўгасе «Бураказводчы» Нясвіжскага раёна. Тут жа незвычайнасць уся хіба што толькі ў назве, астатняе — вясковая проза. «Прапала ваша лета»,— спачувалі «добразычліўцы».

Аднак не спалохаліся студэнткі юрфака БДУ імя У. І. Леніна такіх песімістычных прадказанняў, верылі: рамантыкі і ў «празаічным жыцці» ўдосталь. «І не памыліліся,— гаворыць камандзір атрада Таня Навумовіч.— Тут столькі цікавага, захапляючага, узнёслага. І світанак, які большасць з нас сустрэла тут упершыню, і бадзёрая вясковая раніца і, вядома ж, нашы рагулі (пра кожную з 237 даглядаемых кароў дзяўчаты наперабой гатовы распавядаць цэлыя гісторыі), і нават сон у простай сялянскай хаце здаецца намнога саладзейшы, чым у гарадской кватэры. Мы ўжо зусім як вясковыя».

Зрэшты, і мясцовыя жыхары лічаць іх за сваіх. Даяркі, якіх падмянялі студэнткі, напачатку, праўда, непакоіліся, каб не сапсавалі кароў нявопытныя гараджанкі. Аднак пасля трохдзённага нагляду за зменшчыцамі пераканаліся: «Гэтыя не падвядуць!».

...Іх пяць. Тры Тані, Марына, Анжэла. Прыехалі ў вёску Ужанку па асабістаму жаданню... Пяць «зорачак» з «Млечнага Шляху».

М. МАСТОЎСКІ.
Фота С. БРУШКО.

СПРОБА РЭАНІМАЦЫІ

НАЗАД, ДА «ПРЫМУСОЎКІ»?

Усе высокаразвітыя краіны выкарыстоўваюць наёмную рабочую сілу. Студэнты ведаюць, што вызначаны час яны павінны працаваць на ўборцы ўраджаю. Гэта закон. Чаму б і наш трэці працоўны семестр не «узаконіць»? Я не за тое, што называюць «прымусоўкай». Я — за «усвядомленую неабходнасць». І каб стымул быў акрамя грошай — адзнака ў залікоўцы.

Наогул, лічу, што будучае за прамымі дагаворамі, калі дыялог вядзе навучальная ўстанова. І толькі яна і прымаючая арганізацыя. Зразумела, сёння ВНУ (тэхнікум) не зацікаўлена ў фарміраванні СА, паколькі не мае ад гэтага ніякай карысці. А калі б тыя пералічэнні, што робяць гаспадаркі ў абласныя штабы «на арганізацыю працы», маглі апынуцца ў «казне» навучальнай установы, прычым, у залежнасці ад «якасці» таго ці іншага атрада — строга дыферэнцыравана, мы б мелі куды больш падрыхтаваных байцоў і адпаведна — моцны рух.

В. ЖУКАЎ,
камандзір Слабадзейскага занальнага студэнцкага атрада.

Думкі Віктара Віктаравіча аб шляхах рашэння праблем, што назапасіліся, аб зменах, якія патрабуюцца ў самой сістэме арганізацыі студатрадаўскага руху, у запісу Г. Грынкевіч вы можаце прачытаць у газеце «Знамя юности» (1.09.89 г.).

ПОГЛЯД З-ПАД БРЫВА

«Падрыхтоўка да форуму, выклікае вялікую цікавасць у студэнцтва Казахстана. Глыбока перакананa, што форум павінен рыхтавацца ў першую чаргу рукамі саміх студэнтаў. Лепш за іх ніхто не ведае іх праблем — негатоўнасць да дыялогу са студэнтамі многіх выкладчыкаў, адсутнасць элементарных бытавых выгод. І, зразумела, патрэбна не на словах, а на справе даць студэнтам права вырашаць гэтыя праблемы».

Гулсара АЛТЫНБЕКАВА,
сакратар ЦК ЛКСМ Казахстана.

«Перакананы, што форум патрэбны. У студэнтаў назапасілася шмат праблем, якія патрабуюць вырашэння. Гэта іх удзел у перабудове вышэйшай школы, сацыяльная абароненасць, арганізацыя сельскагаспадарчых работ, становішча студэнцкай сям'і і г. д.

Але патрэбна зрабіць усё, каб форум не стаў месцам пустых размоў. І залежыць гэта ад нас, студэнтаў, членаў падрыхтоўчага камітэта».

Міхаіл МАКІДОН,
студэнт Кішынёўскага сельскагаспадарчага інстытута,
член Падрыхтоўчага камітэта форуму.

«Хацелася б, каб Усесаюзны студэнцкі форум меў вялікі поспех, каб пытанні, якія будуць абмяркоўвацца на ім, вырашыліся на карысць студэнцтва».

Людміла ЯФІМЕНКА,
выпускніца Пяцігорскага педагагічнага інстытута замежных моў.

Чуць не чулі і бачыць не бачылі...

Гэтыя водгукі прыйшлі, як вы зразумелі, не нам. Таму мы вырашылі даведацца думкі наконт правядзення Усесаюзнага студэнцкага форуму студэнтаў універсітэта. Не будзем стамляць цябе, чытач, пералікам усіх выказванняў (яны падобныя адно на другое), прывядзём некалькі найбольш характэрных (на жаль, аўтары іх пажадалі застацца невядомымі).

— Ці чулі пра Усесаюзны студэнцкі форум? Не, не чулі. У нас жа былі канікулы.

— А. што, можаце пасадзейнічаць з паездкай у Маскву?

— Які там форум, у Якуціі мы былі, у студэнцкім атрадзе.

Апытаўшы каля сотні чалавек (у тым ліку і выкладчыкаў), зразумела, што пра Усесаюзны студэнцкі мае субяседнікі ведаюць столькі, колькі трохгадовае дзіця, і нічога канкрэтнага не скажуць.

Страціўшы ўсялякую надзею нешта занатаваць у блакнот, вырашыла зазірнуць у хімічны корпус: а раптам там студэнт больш цікаўны, і мне пашанцуе. Па дарозе звярнула ўвагу на гурт хлопцаў і дзяўчат, якія сядзелі на лаўцы і ажыўлена аб нечым спрачаліся.

— Прабачце, у мяне да вас адно пытанне: «Ці чулі вы што-небудзь пра Усесаюзны студэнцкі форум?»

— А як жа! — тут я, прызнацца, вельмі ўзрадавалася: вось, думаю, нарэшце пашанцавала.— Гэта той, што збірае Пацёкін?

Каментарый, як кажуць, не патрэбны.

А зараз давайце падумаем, чаму ж студэнты універсітэта засталіся ў баку ад падзей, якія адбываюцца ў краіне і датычаць менавіта іх? Ці справа тут толькі ў канікулах? На канікулах газеты таксама выходзяць і ў Якуцію іх дастаўляюць. А што ў перыёдыцы было мала інфармацыі аб форуме, не скажаш. Толькі наша газета звярталася да гэтай тэмы некалькі разоў (дарэчы, яшчэ да канікулаў, у мінулым навучальным годзе). Друкавалі рабочую праграму Усесаюзнага студэнцкага, знаёмілі з тэматычнымі дыскусійнымі цэнтрамі і тымі пытаннямі, якія будуць абмяркоўвацца на іх («Беларускі універсітэт», 11 мая 1989 г.), расказвалі аб рабоце Падрыхтоўчага камітэта («Беларускі універсітэт», 8 чэрвеня 1989 г.) і г. д. Нямала газетнай плошчы адвёў пытанням падрыхтоўкі да форуму цэнтральны і рэспубліканскі маладзёжны друк («Комсомольская правда», «Знамя юности», «Чырвоная змена»).

А справа, відаць, у нашай агульнай абыякавасці, пасіўнасці. Няхай іншыя ўдзельнічаюць, вырашаюць, траціць час і нервы, а мы паглядзім, што з гэтага атрымаецца, і пакрытыкуем, калі нам не спадабаецца.

І ўсё ж хочацца напомніць, што абмяркоўваць і вырашаць будуць тыя, каго мы вылучым. Так што ў вас ёсць яшчэ апошні шанц (да канца гэтага месяца), каб прапанаваць сваіх дэлегатаў на форум. Не заставайцеся ўбаку, бо праблемы, якія мае намер узняць Усесаюзны студэнцкі,— нашы, надзённыя.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

ХТО Ў ІНТЭРНАЦЕ ГАСПАДАР?

Засяленне ў інтэрнат пачынаецца з чаргі. Чаргі за медыцынскай даведкай, квітком на аплату за пражыванне. І, нарэшце, самай галоўнай — чаргі за атрыманнем доўгачаканага ордэра і пропуска. Такая дробязь, як чарга за бялізнай і падушкай, у разлік не бярэцца.

На засяленні можна выявіць цэлыя тыпы чэрг. Адна выгінаецца прыгожай спіраллю, другая расцягваецца прамым, як шпала, ланцугом, або скручваецца абаранкам ці проста бывае бясформенным гуртам. Такія розныя спачатку твары праз некаторы час становяцца да здзіўлення падобнымі. І першапачатковая надзвычайная ўзбударажанасць змяняецца проста абыякавасцю: «Трэба адстаяць».

Апошняе поўнасцю адсутнічала ў чарзе студэнтаў-географаў. Страсці разгараліся з ашаламляльнай хуткасцю.

— Мне ніхто не гаварыў, што трэба адпрацоўваць!

— Я б гэтых Паўсаў да сценкі ставіў і агнямётам.

— Колькі жыву, першы раз бачу!

— Будзем скардзіцца пракурору.

Выкрыкі з чаргі мелі рацыю. Такое сапраўды было ўпершыню. Не засяліліся студэнты, якія

не здалі своечасова пакой,

не адпрацавалі 6 гадзін па добраўпарадкаванню інтэрната,

не прыбіралі круглы год свой пакой,

зашмат прыкладваліся да бутэлькі.

Карацей кажучы, аставаліся за бортам інтэрната № 7 тыя, хто груба парушаў нормы пражывання. Можна запярэчыць, што такія ж у кожным студэнцкім доме ёсць. І нічога, засяляюцца. А як жа з міласэрнасцю, аб якой столькі цяпер гавораць? Людзі мы ці хто, у рэшце рэшт?

Інфармацыя для роздуму

Інтэрнат № 7 — самы вялікі ў Мінску. І падзеі ў ім да нядаўняга часу адбываліся суадносна вялікія таксама. На калідоры ноччу, асабліва на вышэйшых паверхах, было небяспечна выходзіць. Маглі проста зарэзаць (ва ўсялякім выпадку неаднойчы пагражалі нажом). Не кажучы, па сведчанню інтэрнацкіх улад, пра спробы згвалтавання і п'яныя дэбошы ў наяўнасці. На восьмым паверсе, як нядаўна было ўстаноўлена, існаваў свой, прабачце, публічны дом. Факт, вядома, не для прэсы, але... Ложак, застаўлены вялікай геаграфічнай картай. Хто хацеў, той карыстаўся. Многія ведалі і, як гэта водзіцца, маўчалі. Толькі калі п'яныя прыпіралі да сценкі і падстаўлялі нож да горла, прымушалі піць гарэлку, клікалі... Паўса. Таго самага, другога каменданта інтэрната № 7. Апошні раз Паўс меў справу да прыходу камандзіра аператрада з трыма такімі ахвотнікамі частаваць за свой рахунак.

Ліда КАМАРОЎСКАЯ, старшыня прафсаюзнага бюро геафака: «Усе ведаюць, што з прыходам Барыса Паўрысць географаў сведчыць і агульнавядомая гісторыя з крадзяжом інтэрнацкага тэлевізара. Дарэчы, у самы яе разгар першага каменданта інтэрната № 7 Ганну Мікалаеўну Нурметаву забрала хуткая дапамога.

Валодзя КУЛІКОВІЧ, старшыня студэнцкага савета інтэрната: «Заклікамі цяпер можна толькі прымусіць студэнтаў талоны на цукар у прафкоме забраць. У сакавіку-красавіку ў інтэрнаце праводзіўся рамонт. Сіл рамонтнікаў не хапала. Трэба было вынесці смецце са сваіх блокаў, вымыць пакоі. Прыбіралі і самі каменданты, і прыбіральшчыцы. Звярнуліся да студэнтаў. Філфак зрушыўся з мёртвай кропкі пасля двух заклікаў. Мехмат пасля шматлікіх упрошванняў звярнуўся... у юрыдычную кансультацыю. Геафак не зрушваўся, не звяртаўся. Прафсаюзныя ўлады апошніх двух факультэтаў таксама асаблівай актыўнасці не праявілі.

са можна цяпер гаварыць аб нейкім парадку. Да гэтага інтэрнат фактычна быў некіруемым. Студэнты да гэтага засялення не цанілі месца ў інтэрнаце. Ведалі: усё роўна на наступны год заселяць. Яшчэ і лепшы пакой дадуць. Абстаноўка ўседазволенасці, можна сказаць».

А праўда, які сэнс, якая карысць адчуваць сябе гаспадаром?

Тэнісны стол, што быў запісаны за студэнтамі геафака, разваліўся праз месяц. Поўнасцю і беспаваротна. Не без дапамогі саміх студэнтаў. Як сказаў адзін з іх: «Была ў сабакі хата...» Не на каго ж студэнты універсітэта засталіся ў баку ад падзей, якія адбываюцца ў краіне і датычаць менавіта іх? Ці справа тут толькі ў канікулах? На канікулах газеты таксама выходзяць і ў Якуцію іх дастаўляюць. А што ў перыёдыцы было мала інфармацыі аб форуме, не скажаш. Толькі наша газета звярталася да гэтай тэмы некалькі разоў (дарэчы, яшчэ да канікулаў, у мінулым навучальным годзе). Друкавалі рабочую праграму Усесаюзнага студэнцкага, знаёмілі з тэматычнымі дыскусійнымі цэнтрамі і тымі пытаннямі, якія будуць абмяркоўвацца на іх («Беларускі універсітэт», 11 мая 1989 г.), расказвалі аб рабоце Падрыхтоўчага камітэта («Беларускі універсітэт», 8 чэрвеня 1989 г.) і г. д. Нямала газетнай плошчы адвёў пытанням падрыхтоўкі да форуму цэнтральны і рэспубліканскі маладзёжны друк («Комсомольская правда», «Знамя юности», «Чырвоная змена»).

А справа, відаць, у нашай агульнай абыякавасці, пасіўнасці. Няхай іншыя ўдзельнічаюць, вырашаюць, траціць час і нервы, а мы паглядзім, што з гэтага атрымаецца, і пакрытыкуем, калі нам не спадабаецца.

І ўсё ж хочацца напомніць, што абмяркоўваць і вырашаць будуць тыя, каго мы вылучым. Так што ў вас ёсць яшчэ апошні шанц (да канца гэтага месяца), каб прапанаваць сваіх дэлегатаў на форум. Не заставайцеся ўбаку, бо праблемы, якія мае намер узняць Усесаюзны студэнцкі,— нашы, надзённыя.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

Барыс ПАЎС, другі камендант інтэрната № 7: «Калі пачынаў працаваць, думаў: не зразумеюць студэнты такіх жорсткіх патрабаванняў — кіну. Цяпер адступаць не будзем. Упарад — навука. Хоць нервы асабіста мае — горш не бывае. Маці дома не пазнае».

Барыс на пятым курсе філфака. Не адзін, не два студэнты просяць застацца. Асабліва з трынаццатага паверха. Чым вышэй, тым небяспечней.

Даведаўшыся аб пакутах бяздомных географаў, я займеў гарачае жаданне ўвесь гэты наватворны «табар» узяць пад сваю абарону, даць з усяго размаху гэтаму жорсткаму Паўсу. Не ведаю, які ён жорсткі, але калі дэкан геаграфічнага факультэта Расціслаў Афанасьевіч Жмойдзяк у запале папрасіў у Паўса адабраць ордэр з той мэтай, каб парваць на дробныя-дробныя шматкі, Барыс катэгарычна не згадзіўся. Сказаў, што трэба разбірацца з кожным індывідуальна. Так што «чорны» спіс з 42 студэнтаў пакрысе змяншаецца. У кожнай справе выпадковасць адыгрывае значную ролю. У гэтай — таксама. Але, як сцвярджае Валодзя Куліковіч, спіс «адрынутых» мог бы складаць і пяцьдзесят, і семдзесят, і сто. І гэта не рубеж.

...На вечары першакурснікаў БДУ упершыню за ўсю гісторыю яго існавання быў праведзены аўкцыён на адно месца ў любым інтэрнаце. 95 рублёў — столькі выклажыла за яго першакурсніца механіка-матэматычнага факультэта Валянціна Апанасёнак. На пытанне карэспандэнта «Беларускага універсітэта» «Вы шчаслівыя?» Валянціна вельмі коратка адказала: «Безумоўна».

Колькі каштуе месца ў інтэрнаце? Гадзіны бясконцага стаяння студэнтаў у самых розных чэргах? З'едзеныя нервы камендантаў і старшынь ЖБК? Ці шэсць гадзін адпрацоўкі і дваццаць тры рублі наперад, год больш-менш прыстойных паводзін, калі хоць раз на тыдзень патрэбна вынесці смецце з блока?

Зашмат???

А. КОКТЫШ.

ДАІ ІНФАРМУЕ

УВАГА! ДЗЕЦІ!

Так называецца аперацыя, якая праводзіцца ў нашым горадзе з 20 жніўня да 20 верасня. Мэта яе — папярэджанне выпадкаў дзіцячага траўматызму, ахова жыцця і здароўя маленькіх жыхароў нашай зямлі.

Адкуль жа ўзнікла ідэя правядзення месячніка?

Сёлета па стану на 15 жніўня на вуліцах горада трапілі ў аварыі 60 падлеткаў. Пяць з іх загінулі. Вядома, ніякімі словамі нельга суцешыць боль бацькоў. Але, як ні горка ў гэтым прызнацца, на нас таксама кладзецца частка віны. Думаю, не раз кожны з вас быў сведкам такой сітуацыі. Маці, а з ёй і невялікая дачушка, відаць, некуды спяшаюцца. Раптам — чырвонае святло. Нават не паглядзеўшы (пра што павінен ведаць кожны першакласнік) направа і налева, не сцішыўшы хады, маці адразу ступіла на праезжую частку... Тут да месца яшчэ раз напомніць: мы, дарослыя, павінны быць прыкладам. Мы павінны ў першую чаргу клапаціцца аб здароўі сваіх дзяцей. І не толькі ў час правядзення месячніка.

Як жа вядзецца гэта работа студэнтамі, выкладчыкамі і супрацоўнікамі універсітэта?

Толькі за шэсць месяцаў гэтага года здзейснена 7 дарожна-транспартных здарэнняў. 263 чалавекі парушалі правілы дарожнага руху. Прычым, большая колькасць парушэнняў — вадзіцелямі асабістага транспарту. Здаралася, работнікі вышэйшай школы садзіліся за руль у нецвярозым стане.

А што адміністрацыя і грамадскія арганізацыі? Маўчаць. Гэтым адказалі і на пастанову Савета Міністраў БССР «Аб мерах па забеспячэнню бяспекі руху на аўтамабільным і чыгуначным транспарце», у якой гаварылася аб неабходнасці стварэння камісіі па бяспецы дарожнага руху. Такой пакуль не існуе.

Магчыма, аперацыя «Увага! Дзеці!» разбудзіць вас і прымусіць задумацца над сухімі лічбамі статыстыкі.

М. ДЗЕРГАЧОЎ,
дзяржаўтаінспектар Маскоўскага РАУС.

ДЭТЭКТЫЎ! ДЭТЭКТЫЎ!

Што можа быць больш займальным, чым знаёмствы з незвычайнымі прыгодамі герояў той ці іншай кнігі? Пра гэта вы зможаце прачытаць у творах дэктыўнага жанру. Сёлета такія кнігі выйшлі масавым тыражом у выдавецтве «Мастацкая літаратура».

Ужо сама назва аповесці У. Дубінкі «Браты святой ночы» інтрыгуе чытача. З першых старонак твора завязваецца вельмі востры, напружаны сюжэт. Участковы міліцыянер Максім Засаўка сустракаецца з... прывідамі. Хто ж яны, гэтыя ваўкалакі? Выявілася, што вопытны рэцыдывіст Беркут далучыў да сваіх «цёмных» спраў так званых «цяжкіх» падлеткаў...

Няма неабходнасці прадстаўляць нашаму чытачу Агату Крысці — пісьменніцу з сусветнавядомым імем. Яе лепшыя апавяданні прадстаўлены ў штогодніку «Далягляды», што выйшаў у свет у мінулым годзе.

Я. БЯРЭЙШЫК,
загадчыца магазіна «Кнігарня пісьменніка».

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
7 верасня
Зак. 1629.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.